**УДК 101.1+378:94 (476.5-21 Полоцк)**

# СТАТУС ФІЛАСОФІІ ЯК ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ Ў АДУКАЦЫЙНЫМ АСЯРОДДЗІ ПОЛАЦКАЙ ЕЗУІЦКАЙ АКАДЭМІІ

***канд. філас. навук, дац. Г. І. КЛІМОВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск)***

*Разглядаюцца асноўныя характарыстыкі курсаў па філасофіі, прадстаўленых у вучэбным плане Полацкай езуіцкай акадэміі. Мэта даследавання – вызначыць статус філасофіі як вучэбнай дысцыпліны ў межах адукацыйнага асяроддзя Полацкай езуіцкай акадэміі. Разглядаюцца аўтэнтычныя крыніцы педагагічнай сістэмы Таварыства Езуса, якія паўплывалі на станаўленне філасофскай традыцыі Полацкай езуіцкай акадэміі, вызначаецца спецыфіка выкладаемых курсаў яе асноўных прадстаўнікоў – Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага. Навуковая навізна работы заключаецца ва ўвядзенні ў навуковы абарот новага матэрыялу, рэканструкцыі філасофскіх поглядаў полацкіх неасхаластаў, а таксама ў вызначэнні адзінай структурнай канцэпцыі, якая аб'ядноўвала філасофскія курсы аўтараў, выяўленні асноўных філасофскіх аўтарытэтаў, якія паўплывалі на станаўленне праграмных установак Полацкай неасхаластыкі, таксама рэканструяваны асноўныя мэты і задачы курса.*

***Ключавыя словы:*** *Полацкая езуіцкая акадэмія, Полацкая неасхаластыка, Таварыства Езуса, акадэмічная філасофія, курс філасофіі.*

**Уводзіны** Дадзены артыкул прысвечаны даследаванню спецыфікі асэнсавання філасофскіх праблем у межах акадэмічнай дзейнасці Полацкай езуіцкай акадэміі з мэтай іх далейшай рэканструкцыі як цэласнай сістэмы. У сувязі з шэрагам гістарычных падзей канца XVIII – пачатку XIX стст. Полацкая езуіцкая акадэмія стала адным з найбольш уплывовых інтэлектуальных цэнтраў першай чвэрці XIX ст. і адначасова захавала асноўныя характарыстыкі акадэмічнай філасофіі, якая развівалася ў рамках схаластычнай традыцыі. Такім чынам, мэта дадзенага артыкула – вызначыць статус філасофіі як вучэбнай дысцыпліны ў адукацыйным асяроддзі Полацкай езуіцкай акадэміі. Дасягненне вышэйназванай мэты ажыццяўляецца аўтарам праз рэалізацыю наступных задач: па-першае, ахарактарызаваць агульныя для схаластычнай традыцыі інтэлектуальныя перадумовы, якія паўплывалі на філасофскую дактрыну Полацкай езуіцкай акадэміі; па-другое, вылучыць асноўныя характарыстыкі курсаў філасофіі, якія чытаюцца ў рамках Полацкай езуіцкай акадэміі. Разглядаючы філасофію як навучальную дысцыпліну ў рамках сістэмы педагогікі Таварыства Езуса, неабходна адзначыць, што тэма педагагічнай спадчыны таварыства Езуса даследавана дастаткова падрабязна як еўрапейскімі, так і айчыннымі гісторыкамі педагогікі, але статус філасофіі ў дадзеным аспекце, яе мэты і задачы застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў. З вышэй адзначанага вынікае актуальнасць дадзенага даследавання.

**Асноўная частка** Першапачаткова сістэма Св. Ігнацыя Лаёлы не была арыентавана на развіццё школьнай ці ўніверсітэцкай педагогікі, у цэнтры яе ўвагі была падрыхтоўка прапаведніка, здольнага да эфектыўнай місіянерскай дзейнасці. Найбольш яскравым выразам падрыхтоўкі місіянера ў філасофскім плане з'яўляюцца знакамітыя «Духоўныя практыкаванні» Ігнацыя Лаёлы. Аднак, як відавочна з ходу гістарычных падзей, потым адбылося зрушэнне акцэнтаў на фарміраванне пэўнай педагагічнай сістэмы, накіраванай на навучанне асоб дзіцячага і юнацкага ўзросту. Падставай дадзенай сістэмы з'яўлялася праграма Ratio Studiorum. І «Духоўныя практыкаванні», і Ratio Studiorum былі праграмнымі творамі, якія аказалі ўплыў на станаўленне педагагічнай традыцыі Таварыства Езуса.

Філасофскія ідэі ў «Духоўных практыкаваннях» невідавочныя, іх уплыў, а таксама пытанне іх сувязі з рэлігіяй – адной з асноўных праблем схаластычнай традыцыі – прадстаўлены ўскосным чынам. Большая ўвага надаецца фармаванню светапогляду, а менавіта – адпаведным этычным устаноўкам, якія не губляюць для многіх вернікаў актуальнасці і дагэтуль. У саміх «Практыкаваннях» сцвярджаецца, што іх мэта – «ўсялякі спосаб выпрабавання сумлення, разважанні, сузіранні, малітвы славеснай і разумовай, а таксама іншых духоўных дзеянняў» [1, с. 19]. Сярод этычных установак неабходна адзначыць стаічныя ідэалы дасягнення атараксіі ў адносінах да знешніх падзей [1, с. 39], містычнае пазнанне Абсалюту [1, с. 81], практыку трох ступеняў пакоры [1, с. 107], правілы здзяйснення здаровага і добрага выбару [1, с. 115], наяўнасць смутку і ўнутранай пакуты [1, с. 125]. Можна зрабіць выснову, што "Практыкаванні" прысвечаны развіццю індывідуальнага патэнцыялу чалавека, у той час як Ratio Studiorum накіраваны на калектыўнае.

Ratio Studiorum мае мэтай адначасовы духоўны прагрэс усёй супольнасці на падставе хрысціянскага светапогляду, Безумоўна, важнае месца ў гэтым навучальным плане займала тэалогія, але ў той жа час вялікая ўвага надавалася і філасофіі, якая таксама адносіцца да часткі гуманітарнага цыклу. Нельга казаць аб супрацьпастаўленні або падпарадкаваным становішчы філасофіі і тэалогіі, а хутчэй аб сінтэзе гуманізму, тэалогіі і філасофіі.

Яшчэ адзін агульны фактар, які паўплываў на станаўленне навуковай і педагагічнай парадыгмы Полацкай езуіцкай акадэміі, – спецыфічная канцэпцыя ўніверсітэта езуітаў. Асноўны прынцып, які мае падставу ў Канстытуцыі ордэна езуітаў і вызначаны да гэтага Арыстоцелем у Нікамахавай этыцы, гучыць як Bonum quo universalius, eo divinius (Чым універсальней дабро, тым яно бліжэй знаходзіцца да Бога). У гэтых адносінах калектыўная педагогіка ў рамках універсітэта знаходзіцца значна вышэй, чым шлях індывідуальнага ўдасканалення асобы. Дзейнасць у межах універсітэтаў з'яўляецца пэўнай апостальскай місіяй ордэна, што пацвярджаецца і ў самой Канстытуцыі: «Неабходна, каб уплыў аказваўся ў шырэйшай галіне, не толькі ў асобных дысцыплінах навучальнага плана, але таксама і ў людзях, якія будуць вывучаць іх, і асабліва таму, што яны, атрымаўшы розныя акадэмічныя доктарскія ступені, самі працягнуць, быць можа, у іншых месцах і ў іншых краінах выкладаць, як аўтарытэты ў сваёй вобласці, таму, чаму яны навучыліся ў нашых універсітэтах, на славу Божую». [2, с. 178–179].

Фармальна пад паняццем філасофіі ў межах схаластычнай традыцыі аб'ядноўваліся тры дысцыпліны: логіка, натуральная філасофія і метафізіка. Дадзеная структура была запазычаная ў Арыстоцеля. Аднак, змястоўна ў рамках гэтых курсаў раскрываецца дастаткова багаты змест. Даследчыкі вылучаюць наступныя класічныя пытанні, якія разглядалі выкладчыкі ў межах пазначаных напрамкаў: эпістэмалогія, логіка, рыторыка, псіхалогія, педагогіка, маральная тэалогія, метафізіка, палітычная філасофія [3, с. 7].

Другі аспект, які аказаў уплыў у тым ліку і на станаўленне ўсёй педагагічнай традыцыі Полацкай езуіцкай акадэміі, – гэта працэсы інстытуалізацыі філасофіі на беларускіх землях у якасці педагагічнай дысцыпліны, якія пачаліся ўжо ў XVI ст. і атрымалі далейшае развіццё на працягу перыяду Новага часу. Р. Плечкайціс адзначае, што на гэты час прыпадае «зараджэнне і распаўсюджванне прафесійнай філасофіі, філасофскай адукацыі свецкай моладзі, а таксама духавенства ў навучальных установах». Высока ацэньвае дадзены даследчык ролю і так званай «школьнай філасофіі» (г. зн. схаластычнай), адзначаючы, што яна інфармавала аб найноўшых дасягненнях у прыродазнаўстве, а таксама аб новых філасофскіх ідэях [4, с. 115].

Такім чынам, сярод перадумоў, якія паўплывалі на статус філасофіі ў Полацкай езуіцкай акадэміі, сталі, па-першае, праграмныя крыніцы, якія сфарміравалі педагагічную сістэму ордэна езуітаў, па-другое, наяўнасць філасофскай традыцыі на беларускіх землях.

Філасофская традыцыя Полацкай езуіцкай акадэміі з'яўлялася прадаўжальнікам ідэй схаластычнай філасофіі, якая ўжо мела месца на працягу дастаткова доўгага гістарычнага перыяду (Полацкі езуіцкі калегіум). Толькі паміж 1784–1800 гг. тут працавала цэлая плеяда таленавітых выкладчыкаў у галіне філасофіі, гэта Я.М. Магнані, а. М. Петух, а. Джузэпе Анджаліні, Пётр Естко, Ксаверый Навагк, Юзаф Каменскі і інш. [5, с. 17].

Прынцыпы педагагічнай дзейнасці Полацкай езуіцкай акадэміі заставаліся злучанымі з асноўнымі ідэямі, прадстаўленымі ў Ratio Sudiorum, а менавіта – накіраванымі на дасягненне адной з вышэйшых каштоўнасцяў сацыяльнай сістэмы схаластычнай традыцыі – дасягненне агульнага дабра. Так Бжазоўскі адзначаў у адным са сваіх лістоў расійскаму імператару Аляксандру I: «Дамо магчымасць нашым канстытуцыям забяспечыць, каб у нас заўсёды была вялікая колькасць настаўнікаў, якія б выхоўвалі маладых людзей, каб яны сталі грамадзянамі, вернымі свайму манарху і затым здольнымі добра выконваць абавязкі, якія будуць давераны грамадствам» [5, с. 37].

Вывучэнне філасофіі ў Полацкай езуіцкай акадэміі падзялялася на тры часткі: логіку, дыялектыку і метафізіку ў адпаведнасці са схаластычнай традыцыяй. Логіка разглядала паняцце разважання і яго асноўных складнікаў, правілы разважання, крытэрыі праўдзівасці і ілжывасці меркавання. У межах метафізікі выкладаліся класіфікацыя тварнага і нетварнага быцця, пытанні тэорыі натуральнага права, у адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі вучэння Тамаша Аквінскага даследаваліся канцэпты душы (раслінная, жывёльная і чалавечая) і Абсалюту, у якасці асноватворнага вызначаўся прынцып крэацыянізму [5, с. 83]. Пасля вывучэння метафізікі студэнты пераходзілі да яшчэ адной філасофскай дысцыпліны – этыкі (маральнай філасофіі), асноўная праблематыка якой закранала паняцце шчасця чалавека, яго правы і абавязкі з пункту гледжання Св. Пісання і тэорыі натуральнага права [5, с. 83].

Тэкстуальная база падручнікаў па філасофіі Полацкай езуіцкай акадэміі прадстаўлена двума філасофскімі курсамі: «Пачаткі філасофіі» Дж. Анджаліні, выдадзенага ў 1819 г. у друкарні Полацкай езуіцкай акадэміі, а таксама В. Бучыньскага пад той жа назвай, выдадзенага часткамі ў Вене цягам 1843–1844 гг. Апошні курс хоць і быў надрукаваны ў Аўстра-Венгерскай Імперыі, можа быць аднесены да спадчыны Полацкай езуіцкай акадэміі. Так, І. Гіжыцкі адзначае, што курс прадстаўлены лекцыямі, прачытанымі В. Бучыньскім у перыяд працы ў Акадэміі.

Да гэтага часу недаследаванымі застаюцца як форма, так і змест дадзеных курсаў. Такога кшталту творы былі шырока распаўсюджаны ў межах схаластычнай традыцыі ў перыяды так званай «другой схаластыкі» і «барочнай схаластыкі». Як і творы Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага, яны ўяўляюць сабой усёабдымныя філасофскія сістэмы, дзе развіццё філасофскай думкі ідзе па лініі ўзыходжання ад логікі да метафізікі, а адтуль да этыкі. Прадстаўленая полацкімі аўтарамі схема стасуецца з еўрапейскімі падручнікамі акадэмічнай філасофіі розных навучальных устаноў рэлігійнага кірунку.

У дачыненні да формы даследчыкамі (Я. Шмутц) выдзелены тры асобныя тыпы падобных курсаў. Першы – «класічны» прадстаўлены наступнымі часткамі: логіка, фізіка, псіхалогія, метафізіка, этыка. Такая структура была характэрна для большасці філасофскіх курсаў рэлігійных ордэнаў, у прыватнасці для працы вядомага камбрыйскага схаласта – Арыягі. Другі тып – «сучасны» падзяляецца на два падтыпы. Для падтыпу А характэрна наступная класіфікацыя – логіка, этыка, фізіка, метафізіка. Ён быў уласцівы прадстаўнікам французскіх рэлігійных ордэнаў, а таксама пратэстантам. Падтып Б прадстаўлены трыма часткамі – логіка, метафізіка, этыка, распаўсюджаны пасля з'яўлення філасофіі Р. Дэкарта [6, с. 250]. Курсы Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага адносяцца да падтыпу Б. Я. Шмутц адзначае, што ў Італіі ён распаўсюджваўся праз працы філосафа-езуіта Джэнавязі [6, с. 250]. У працы Дж. Анджаліні можна знайсці спасылкі на дадзенага аўтара [8, с. 91]. Такім чынам, ён з'яўляецца, магчыма, адной з тэарэтычных крыніц станаўлення філасофскай традыцыі Полацкай езуіцкай філасофіі.

Структуры работ Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага – падобныя. Дзяленне курса філасофіі Дж. Анджаліні адпавядае яго бачанню філасофскіх ведаў. Паводле Анджаліні філасофія павінна разглядацца ў якасці 5 вялікіх вектараў: логіка як вучэнне і мастацтва думаць, метафізіка як пытанні суадносін розных відаў быцця, фізіка як даследаванне натуральных з'яў і іх прычын, этыка, якая вызначае правілы паводзін чалавека. У адпаведнасці з гэтым дзяленнем Дж. Анджаліні будуе і структуру свайго курсу, вылучаючы ў ёй наступныя вялікія часткі 1) логіка, 2) дыялектыка, 3) метафізіка.

Логіка і дыялектыка ўяўляюць сабой два кірункі логікі, але першая з іх разглядаецца як элементарная: прадстаўлена раздзеламі «Чатыры аперацыі розуму» (паняцце, меркаванне, абгрунтаванне, метад), а таксама «Аб мэце логікі», якой з'яўляецца лагічная ісціна, так Дж. Анджаліні піша: «Ісціны логікі бываюць двух відаў: фармальная і аб'ектыўная. Фармальная – гэта адпаведнасць ідэі сабе самой, аб'ектыўная – адпаведнасць ідэі вызначанай рэчы» [7, с. 70]. Раздзел логікі пабудаваны ў форме гатовых пытанняў і адказаў.

Дыялектыка закранае пытанні крытэрыяў ісціны і агульных правілаў аргументацыі, аўтар адыходзіць ад формы пытанняў і адказаў, ужываючы метад дыспутацыі (methodus disputationis), спачатку даецца асноўная тэза і яе тлумачэнне, затым прыводзяцца пярэчанні, наступнымі ідуць адказы на пералічаныя вышэй пярэчанні.

Метафізіка падзелена на агульную і прыватную. Першая даследуе пытанні быцця ў цэлым, апошняя – быццё цялесных аб'ектаў [7, с. 148]. Агульная метафізіка падзяляецца на анталогію, якая разглядае быццё і яго віды, этыялогію, якая даследуе прычыны, віды прычыннасцяў і аксіяматычныя сцвярджэнні, а таксама касмалогію, якая разглядае пытанні пабудовы свету, яго паходжання, дасканаласці і законаў.

Нажаль, другая частка метафізікі недаступная. Таксама Р. Дароўскі адзначае, што была, відаць, частка, прысвечаная этыцы, [8, с. 232], але яна страчана.

Твор В. Бучыньскага складаецца з трох, выдадзеных асобна ў розны час, частак. Першая частка, прысвечаная праблемам логікі, была апублікавана ў Вене (1843 г.), мае два раздзелы, першы – чыстая ці элементарная логіка, разглядае праблемы паняцця, меркавання, высновы і метаду, структурна адпавядае курсу Дж. Анджаліні. Складаецца з чатырох частак, дзе даследуюцца паняцце знака як адлюстравання ідэі, класіфікацыі суджэнняў і сувязі паміж імі, а такасам законы, на падставе якіх суджэнні будуюцца, таксама разглядаецца паняцце высновы, яе форм, метады аналізу і сінтэзу.

Прыкладная логіка прысвечана разгляду магчымых памылак у працэсе разважання, а таксама шляхах дасягнення ісціны, асобна ставіцца пытанне аб магчымасцях розуму да зразумення ісціны і крытэрыях ісціны [9, с. 81–157]. Дадзеная частка таксама адпавядае структуры курса Дж. Анджаліні.

Метафізіка была апублікавана ў Вене ў 1844 г. [10]. Складаецца з раздзелаў, якія разглядаюць праблемы анталогіі, касмалогіі, псіхалогіі і тэалогіі. Анталогія даследуе паняцце быцця ўвогуле, пытанні суадносін існага і магчымага, субстанцыі і яе модусаў, а таксама розных відаў і класаў быцця. Касмалогія прысвечана пытанням прычын і мэт існавання свету, яго паходжання, натуральным законам яго існавання і ўплыву на натуральныя законы звышнатуральных прычын. Асобна вывучаецца пытанне дасканаласці свету як адказ на ідэю Лейбніца аб лепшым з магчымых светаў [10, с. 21–151]. Псіхалогія аналізуе паняцце душы і яе асноўныя характарыстыкі: здольнасць да валення і пазнання, суадносіны душы і цела [10, с. 152–235]. Тэалогія разглядае пытанні існавання Бога і адносіны са светам [11, с. 236–299].

Вянчае сістэму В. Бучыньскага этыка, апублікаваная ў 1844 г. [11]. Гэта дастаткова рэдкі ўзор сістэматызацыі ідэй маралі і права ў рамках творчай спадчыны прадстаўнікоў Полацкай схаластыкі. Складаецца з увядзення ў этыку, якое апісвае прыроду і межы так званай "практычнай філасофіі", кароткі нарыс яе гісторыі развіцця, а таксама прадмет вывучэння этыкі, падзеленай на агульную і прыкладную. Першая частка разглядае пытанні падстаў чалавечага дзеяння, у тым ліку і дзеяння маральна арыентаванага, суадносін агульных і натуральных законаў, а таксама асноўных прынцыпаў, якія ляжаць у падмурку натуральнага права. В. Бучыньскі надае ўвагу суадносінам знешніх законаў і ўнутранага закону чалавека. Завяршае гэтую частку пытанне суадносін заган і цнотаў у чалавечым жыцці [11, с. 113–115]. Другая частка прысвечана абавязку чалавека і яго абавязкам адносна Бога, самога сябе і іншых людзей. Фундаваная канцэптамі justicia (справядлівасці з закону) і benevolentia (справядлівасці з міласэрнасці). Завяршаецца

этыка раздзелам, які па сутнасці з'яўляецца пераходным ад маральнай філасофіі да філасофіі права [11, с. 116–203].

Асобную цікавасць уяўляюць тэарэтычныя крыніцы, якія выкарыстоўваліся аўтарамі для абгрунтавання сваёй філасофскай пазіцыі. Дж. Анджаліні спасылаецца на Арыстоцеля [7, с. 24], Сенеку [7, с. 101], аўтарытэт Тамаша Аквінскага і Св. Аўгустына [7, с. 178, 179, 214], найбольш значнага прадстаўніка Другой схаластыкі – Фр. Суарэса [7, с. 200]. Сярод сучаснікаў ёсць спасылкі на філосафа Антоніа Джэнавязі, які лічыцца адным з заснавальнікаў каталіцкай асветніцкай публіцыстыкі [7, с. 91], а таксама яшчэ аднаго прадстаўніка Таварыства Езуса – прафесара Інсбургскага ўніверсітэта, аднаго з асноўных апанентаў І. Канта – Якуба Цалінгера [7, с. 104, 105], вядомага французскага тэолага др. пал. XVIII ст., крытыка французскай Асветы Нікаласа-Сільвестра Берж'е [7, с. 107], малавядомага, але ўплывовага прадстаўніка рэлігійнай думкі XVIII ст. Іаана Іванчыча [7, с. 180].

У працах В. Бучыньскага, акрамя тэндэнцыі спасылацца на прадстаўнікоў сярэднявечнай традыцыі – Св. Аўгустына [10, с. 44], Тамаша Аквінскага [9, с. 99], Тэртуліяна [9, с. 39], маюцца ідэі ўжо згаданых вышэй Антоніа Джэнавязі [9, с. 36] і Якуба Цалінгера [9, с. 36]. Адметнай рысай дадзенага курса з'яўляецца таксама дастаткова вялікая колькасць спасылак на крыніцы, якія засяроджваюцца на крытыцы ідэй філасофіі І. Канта (напрыклад, Петэр Міёці «Аб хлусні і бязбожнасці кантыянскай сістэмы» [9, с. 21]). Ступень іх уплыву на фарміраванне ідэй прадстаўнікоў Полацкай неасхаластыкі патрабуе далейшага вывучэння.

**Высновы.** На спецыфіку выкладання філасофіі, а таксама і на само станаўленне філасофскай традыцыі Полацкай неасхаластыкі паўплывалі два асноватворныя фактары: па-першае, філасофская традыцыя, сфарміраваная ў межах інтэлектуальнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага, па-другое, наяўнасць уласнага педагагічнага стандарту адукацыйнай дзейнасці Таварыства Хрыста – Ratio Studiorum.

Ratio Studiorum мела на мэце стварэнне «ідэальнага грамадства» (societas pefecta), заснаванага на хрысціянскіх цнотах, важнае значэнне для дасягнення дадзенага сацыяльнага ідэалу мела і філасофія, асабліва яе апошні элемент – этыка (маральная філасофія). Маральнае удасканаленне было адной з галоўных задач педагагічнай сістэмы Таварыства Езуса. Класічнай схемай выкладання філасофіі ў сценах Полацкай езуіцкай акадэміі была па сутнасці схаластычная, прадстаўленая ў рамках філасофіі чатырма дысцыплінамі: логіка, анталогія, метафізіка і маральная філасофія.

Змястоўная частка курсаў, якія выкладаюцца ў Полацкай езуіцкай акадэміі, можа быць рэканструявана на падставе работ Дж. Анджаліні «Пачаткі філасофіі для студэнтаў акадэміі» і В. Бучыньскага «Пачаткі філасофіі» ў трох тамах. Структура падобных курсаў, якая атрымала афармленне ў перыяд Другой схаластыкі, да пачатку XIX стагоддзя зведала значныя змены. Курсы Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага адносяцца да пазнейшага так званага «сучаснага» тыпу, сфармаванага пад уплывам італьянскага філосафа-езуіта А. Джэнавязі. Таксама неабходна адзначыць структурнае падабенства курсаў Дж. Анджаліні і В. Бучыньскага.

Тэарэтычныя крыніцы, якія выкарыстоўваюцца для абгрунтавання пазіцыі полацкіх схаластаў, падзяляюцца на тры вялікія блокі. У першым – аўтары класічнай антычнай і схаластычнай традыцыі: Арыстоцель, Платон, Тэртуліян, Фама Аквінскі, Св. Аўгусцін. Да другога адносяцца рэлігійныя філосафы перыяда Асветы, змушаныя займаць апалагетычную пазіцыю ў адносінах да філафскіх сістэм гэтага часу: Н.С. Берж’е, А. Джэнавязі, Томас Рыд. Асобна неабходна вылучыць блок, звязаны з крытычным асэнсаваннем ідэй І. Канта, – гэта праграмныя ўстаноўкі, запазычаныя з прац Я. Цалінгера, П. Міёці.

Такім чынам, філасофія ў Полацкай езуіцкай акадэміі была адным з асноўных курсаў, неабходных для фармавання светапогляду студэнта. Выкладанне было арыентавана на рэалізацыю некалькіх задач: па-першае, яно выконвала ролю злучальнага звяна паміж прыродазнаўчымі навукамі і тэалогіяй, па-другое, мела таксама выхаваўчую мэту: фарміраванне члена грамадства, які кіруецца хрысціянскімі дабрадзейнасцямі. Каранямі традыцыі Полацкай неасхаластыкі былі як духоўныя ўстаноўкі Таварыства Езуса, так і філасофская традыцыя, якая існавала на полацкіх землях задоўга да з'яўлення тут Полацкай езуіцкай акадэміі. Структурна курсы філасофіі адпавядаюць тыпу акадэмічнай філасофіі, якая ідзе ад А. Джэнавязі. Што да філасофскіх аўтарытэтаў, то гэта прадстаўнікі антычнай традыцыі, класічнай сярэднявечнай схаластыкі, крытыкі ідэй Асветы, а таксама ідэйныя апаненты І. Канта.

ЛІТАРАТУРА

1. Лойола, И. Духовные упражнения. Духовный дневник / И. Лойола. – М. : Ин-т теологии, философии и истории Святого Фомы, 2006. – 376 с.
2. The constitutions of the Society of Jesus and their complementary norms: a complete English translation of the official Latin texts. – Saint Louis, 1996. – 527 p.
3. Jesuit philosophy on the Eve of Modernity. – Leiden, Boston : Brill, 2019. – 463 p.
4. Плечкайтис, Р. Зарождение философского образования в Великом Княжестве Литовском / Р. Плечкайтис // Топос. – 2004. – № 2. – С. 108–116.
5. Giżycki, J.M.A. Materiały do Dziejów Akademii Połockiej i szkół od niej zależnych / J.M.A. Giżycki. – Kraków, 1905. – 288 s.
6. Oxford Handbook to Medieval Philosophy. – Oxford University Press, 2012. – 245 p.

7. Angiolini, G. Institutiones philosophicae ad usum studiosorum Academiae Polocensis / G. Angiolini. – Polock, 1819. – 319 p.
8. Darowski, R. Filozofia jezuitów na ziemiach dawnej rzechypospolitej w XIX wieku / R. Darowski. – Kraków : Akademia Ignatianum, 2013. – 390 s.
9. Buczyński, V. Instutiones philosophicae, pars prima continens logicam cum praevis universam philosophiam introductione / V. Buczyński. – Viennae, 1843. – 159 p.
10. Buczyński, V. Instutiones philosophicae, pars secunda continens metaphisicam / V. Buczyński. – Viennae, 1844. – 303 p.
11. Buczyński, V. Instutiones philosophicae, pars tertia continens ethicam / V. Buczyński. – Viennae, 1844. – 206 p.

*Пастыпіў 28.10.2022*

## THE STATUS OF PHILOSOPHY AS AN ACADEMIC DISCIPLINE IN THE EDUCATIONAL ENVIRONMENT OF THE POLOTSK JESUIT ACADEMY

***H. KLIMOVICH***
***(Belarusian State Medical University, Minsk)***

*The article examines the main characteristics of philosophy courses presented in the curriculum of the Polotsk Jesuit Academy. The purpose of the study is to determine the status of philosophy as an academic discipline within the educational environment of the Polotsk Jesuit Academy. There are considered authentic sources of the pedagogical system of the Society of Jesus, which influenced the formation of the philosophical tradition of the Polotsk Jesuit Academy, as well as the specifics of the courses taught by its main representatives - G. Angiolini and V. Buchyńsky. The scientific novelty of the work consists in the introduction of new material into the scientific circulation, the reconstruction of the philosophical views of the Polotsk Neo-Scholastic representatives, as well as the definition of a single structural concept that united the philosophical courses of the authors, the identification of the main philosophical authorities that influenced the formation of the ideas of the Polotsk authors. There are also reconstructed the main aims and objectives of the course.*

***Keywords:*** *Polotsk Jesuit Academy, Polotsk Neo-Scholasticism, Society of Jesus, academic philosophy, philosophy course.*